**Борсук Н.М.** (г. Брэст)

# ЭПІСТАЛЯРНАЯ СПАДЧЫНА ТАДЭВУША КАСЦЮШКІ

Т. Касцюшка не быў публіцыстам, літаратарам у прамым сэнсе гэтага слова. Ён быў палкаводцам, барацьбітом. Дзякуючы намаганням спадкаемцаў палітычнага дзеяча і яго сакратара, бліжэйшага сябра – Юзафа Паўлікоўскага, да нас дайшлі акты, артыкулы, нататкі, лісты, напісаныя Т. Касцюшкам альбо яго паплечнікамі. Гэта датычыцца і брашуры “Ці могуць палякі дасягнуць незалежнасці?” Гэтая кніга ўтрымлівае думкі і меркаванні сяброў, аднадумцаў паўстанца па акрэсленым пытанні.

З лістоў Т. Касцюшкі да Міхаіла Залескага, сястры Ганны Эсткавай, Поля Дэлароша перад намі паўстае вобраз самотнага чалавека. Пакутуе яго душа. Т. Касцюшка ніколі не ўтойваў сваё абурэнне антынацыянальнай палітыкай прадажных магнатаў. У выніку – аднаму з самых адукаваных і дасведчаных афіцэраў у Рэчы Паспалітай ні ў корпусе кадэтаў, ні ў арміі не знайшлося пасады. У тыя часы яе можна было набыць за грошы (казалі, што каштавала пасада прыкладна 18 тыс. злотых). Напачатку Т. Касцюшка шукаў заробку як хатні настаўнік, а потым вымушаны быў пакінуць радзіму. Бясспрэчна, адарванасць ад роднага краю паўплывала на яго настрой, светабачанне. Паўночная Амерыка прыняла Т. Касцюшку цывілізавана, яго высокая адукацыя, нястомная энергія, ваенны талент барацьбіта былі заўважаны і запатрабаваны. Дж. Вашынгтон, адзін з заснавальнікаў ЗША, пасля бітвы пад Саратогай у лісце ад 10.11.1877 г. пісаў старшыні Кангрэса: “Касцюшка з’яўляецца чалавекам навукі і вышэйшых якасцей. Згодна з атэстацыяй, якую маю аб ім, заслугоўвае, каб меціць яго на прыкмеце”.

Эпістальярная спадчына [1] Т. Касцюшкі, безумоўна, мае вялікую каштоўнасць, асабліва калі ўявіць, што лісты, пра якія пойдзе размова, былі напісаны ў XVIII ст. Мэтанакіраваны, мужны чалавек адчуваў у сабе вялікія патэнцыяльныя магчымасці. Яго максімалізм стымулюецца роздумам пра вечнасць. З пункту погляду Т. Касцюшкі, пагардлівае стаўленне да смерці нараджае ў чалавека надзею на паляпшэнне лёсу

нашага і будучага пакаленняў. Са звароту да суайчыннікаў (Кракаў, 24 сакавіка 1794 г.) выразна прасочваецца пазіцыя Т. Касцюшкі, які быў перакананы, што абставіны мацнейшыя за нас, і мудры час выкрые сапраўдную сутнасць кожнага чалавека, яго як станоўчыя, так і адмоўныя бакі дзейнасці (Ліст да Ізабэлы Чартарыйскай).

Меркантыльныя матывы людскіх паводзін здаюцца Т. Касцюшку дробязнымі, вартымі пагарды. Слабасць, душэўныя ваганні, адсутнасць пастаянства ён лічыў самымі страшнымі ворагамі не толькі асобнага чалавека, але і няшчасцем для Польшчы. Дарэчы, Т. Касцюшка даражыў такой рысай характару, як "пастаянства думкі" (Ліст да Юзафа Пашкоўскага). Яму было крыўдна, што менавіта прадстаўнікам польскай нацыі гэтай якасці і не хапае. З пункту погляду Т. Касцюшкі, гэта невыпадкова, бо палякі амаль што не імкнуцца асэнсаваць, зразумець паводзіны людзей, рухі чалавечых лёсаў, цікавыя як выявы значных, сутнасных законаў існавання.

Як ні дзіўна, але заняпад Польшчы Т. Касцюшка, як бачна з брашуры "Ці могуць палякі дасягнуць незалежнасці?", не звязваў з немагчымасцю дзяржавы супрацьстаяць непрыяцелю, а бачыў у непастаянстве светапогляду, у абыякавым стаўленні паляка да жыцця нацыі, краіны. Як тонка заўважана ў лісце да генерала Хрушчова: "Нават справядлівая помста не характэрна сэрцу паляка".

Першая дабрачыннасць асобы, па перакананні Т. Касцюшкі, заключаецца ў любові да Радзімы – "не наракай на лёс Айчыны". ("З лагера пад Ігалом'ем", 25 красавіка 1794 г.). Таму і не праводзіў публіцыст мяжу паміж ваенным і цывільным насельніцтвам: усе яны абаронцы Айчыны.

Т. Касцюшка высока цаніў свабоду – "блага, якое даравана чалавеку Богам" ("З лагеры пад Макотавым", 24 верасня 1794 г.). У брашуры "Ці могуць палякі дасягнуць незалежнасці?" ён дае наступнае тлумачэнне паняццю "свабода": "Свабода – гэта не навука, а духоўная патрэба. Свабода робіць значны ўплыў на шчасце чалавека, як свежае паветра на здароўе". Т. Касцюшка выказвае цікавае меркаванне наконт таго, што недастаткова толькі марыць пра незалежнасць, неабходна яшчэ верыць у свае сілы, мець мужнасць, каб змагацца за яе. Ён перакanaўча сцвярджае: не будзе шчасця, славы, годнасці таму народу, які дасягае пачуцця незалежнасці не асабістымі намаганнямі, а праз дапамогу звонку. Адважыцца быць свабодным – гэта першы крок на шляху вызвалення ад невуцтва, а першы крок да перамогі – гэта вера ва ўласныя сілы, з гэтымі словамі звяртаецца шчыры патрыёт сваёй Айчыны да суайчыннікаў ("Зварот да суайчыннікаў", Кракаў, 24 сакавіка 1797 г.). У лісце да Міхала

Залескага Т. Касцюшка цвёрда заяўляе: “Прыгонны – гэта слова павінна быць праклята ў адукаваных народаў”.

Т. Касцюшка акцэнтуе нашу ўвагу на духоўным удасканаленні асобы. На думку палітычнага дзеяча, росквіт краіны залежыць ад колькасці ў ім шчаслівых людзей. У брашуры “Ці могуць палякі дасягнуць незалежнасці?” палкаводзец выказвае цікавае меркаванне наконт чалавечай душы, якая не з'яўляецца нейкай фізічнай машынай, якую нельга ўзрушыць нават цудадзейным узмахам рукі, але можна ўдасканаліць маральнымі сродкамі. “У арміі павінны гарманічна яднацца дысцыпліна, маральна-этычныя прынцыпы, павага да асобы салдата, але салдат не можа быць чалавекам-свавольным, сляпой зброяй”.

Чалавекам, які ўвасабляў у сваёй душы лепшыя чалавечыя якасці, быў для Т. Касцюшкі Джэферсан, аўтар Дэкларацыі незалежнасці, прэзідэнт ЗША, які быў абраны на гэтую пасаду ў 1800 г. У лісце ад 10 кастрычніка 1800 г. Т. Касцюшка [2] звяртаецца да свайго сябра з просьбай, каб той заставаўся на сваёй пасадзе дабрачынным рэспубліканцам, сумленным і справядлівым чалавекам, без раскошы і асабістых амбіцый, “адным словам, будзь Джэферсанам і маім сябрам”. З другога ліста да сябра ад 1 сакавіка 1811 г. чытач можа даведацца пра планы Т. Касцюшкі, якія, на жаль, не ажыццявіліся. Ён марыў увесці рэспубліканскі знак (залаты, сярэбраны, жалезны) за вынаходніцтва ў навуцы, мастацтве, сельскай гаспадарцы. Т. Касцюшка раіць мастакам, навукоўцам не пераймаць слепа няхай нават і самыя лепшыя дасягненні іншых краін, а, абапіраючыся на звычаі свайго народа, улічваючы ўмовы іх жыцця, ствараць сваё арыгінальнае (Ліст да генерала Патоцкага ад 16 жніўня 1790 г., Люблін).

Ліст Т. Касцюшкі ад 15 жніўня 1817 г. уключае парады для маладога Зелтнера, які накіроўваецца ў Польшчу. Ён хвалюецца за будучыню маладога чалавека і дае яму карысныя парады. Т. Касцюшка хоча яго бачыць сціплым, эканомным, суровым у адносінах да сябе, але спагадлівым да іншых, асабліва літасцівым да ўбогіх, удзячным да тых, хто спрыяе яго шчасцю, раіць заўсёды быць карысным людзям, справе, не знаёміцца са злымі людзьмі, а толькі з добрымі, жыць у гармоніі з прыродай: уставаць рана, у шэсць гадзін раніцы, і дзень абавязкова пачынаць з малітвы. Вучыцца захоўваць тайну, якую даверылі яму як святыню, быць мілым, уважлівым у кампаніі, пазбягаць сябелюбства, хлусні, вучыцца весці дыскусію: не спрачацца, а спакойна і настойліва шукаць ісціну. Т. Касцюшка рэкамендуе Зелтнеру чытаць кнігі. І менавіта тыя, якія абагачаюць думкі, паляпшаюць густ, пашыраюць кругагляд. На наш погляд, разгледжаны ліст уяўляе сабой своеасаблівы кодэкс

маральных прынцыпаў, якім павінна кіравацца моладзь у сваіх паводзінах, адносінах да людзей.

Бясспрэчна, знаёмства з эпісталярнай спадчынай Т. Касцюшкі, з дакументамі, што былі напісаны пры яго непасрэдным удзеле, з нататкамі з уласнага сшытка Т. Касцюшкі "Філасофія нораваў", які вёў ён у кадэцкім корпусе, паглыбляе нашы ўяўленні аб Т. Касцюшку як чалавеку. Радкі з яго лістоў, нататак іскрацца глыбінёй мудрасці: "Перамагчы самога сябе – гэта самая вялікая перамога" (са сшытка "Філасофія нораваў"); "Жыццё ў сям'і і свабода з'яўляюцца самымі лепшымі дарамі, якімі прырода надзяліла род людскі" (З ліста Вільямсу, Парыж, 26 жніўня 1784 г.).

**Літаратура**

1. Tadeusza Końcuszki. Wskazania obywatelske. Wybral / słowem wstępnym i kalendarium kościuskowskim opatrzyl prof. dr Henryk Mościcki ; Polska Fundacja Kościuszkowska. – Warszawa, 1992.

2. Żuraw, J. Filozofia oświeceniowa Tadeusza Kościuszki / J. Żuraw. – Częstochowie : Wydaw. WSP, 2003.